Яўген ГАРАДНІЦКІ

# ДЗВЕ ПАЭМЫ

*Пра «Новую зямлю» і «Сымона-музыку» Якуба Коласа напісана вельмі шмат. Аднак не так багата даследаванняў, у якіх гэтыя выбітныя творы суадносяцца між сабой. Асноўны вынік супастаўлення зводзіцца звычайна да таго, што першая з паэм разглядаецца як твор рэалістычны, другая — як рамантычны.*

*Гэтыя паэмы шмат у чым адрозніваюцца між сабой, паколькі іх аўтар акурат і ставіў сабе за мэту стварыць штосьці новае, не падобнае да таго, што існавала раней. Але трэба мець на ўвазе і тое, што гэтыя найвыдатнейшыя творы ўсё ж ім суадносіліся між сабой у самім працэсе напісання, успрымаліся як узаемадапаўняльныя.*

## Прадметнасць і сімвалізм

Творчая спадчына Коласа знаходзіць новыя прачытанні, якія паглыбляюць веды пра мастацкі свет класіка беларускай літаратуры. У сваёй кнізе «Ад тэксту да хранатопа» (2009) П. Васючэнка заўважае: «Яшчэ нядаўна гаворка пра сімвалізм у творчасці Якуба Коласа падалася б недарэчна-дзівацкай, уважаючы на матэрыялістычную ўгрунтаванасць спадчыны вялікага эпіка, яе пэўную рацыянальнасць і беларускі традыцыяналізм». На яго думку, падыходы да гэтай праблемы відавочна змяніліся ў наш час. Для творчасці Коласа, як і шэрагу іншых пісьменнікаў-класікаў, як даводзіць даследчык, уласцівы праявы сімвалісцкага светабачання. У Коласа яны выяўляліся перш за ўсё ў скіраванасці ўвагі герояў да таямнічага ў навакольным свеце, у іх роздумах над загадкамі быцця. Звяртаючыся да паэмы «Новая зямля», П. Васючэнка вылучае раздзелы «Вечарамі», «Таемныя гукі», «Воўк». Менавіта ў іх найбольш выразна выяўляюцца вышэйадзначаныя рысы, раскрываецца тое, што даследчык называе «зямной таямніцай» або «зямной трансцэндэнцыяй».

Такім чынам, П. Васючэнка бачыць спецыфіку коласаўскага сімвалізму ў спалучэнні зямнога з трансцэндэнтным. Увага даследчыка завастраецца на тых момантах, калі ў творах адбываецца «прарыў у сферу трансцэндэнцыі», калі за пэўнымі прыроднымі з'явамі коласаўскімі героямі прадчуваецца іх стоеная, неспазнавальная сутнасць.

Назва аднаго з мастацкіх напрамкаў, што склаўся напрыканцы XIX стагоддзя — сімвалізм — недвухсэнсоўна сведчыць пра тое, што ў аснове яго паэтыкі знаходзіцца сімвал як складанае спалучэнне прадметнага і ўмоўнага, рэальнага і трансцэндэнтнага. Разам з тым, неабходна адзначыць, што сімвал нярэдка сустракаецца ў творах іншых мастацкіх напрамкаў і стыляў. Сімвал — гэта адзін з найбольш распаўсюджаных спосабаў моўнага выражэння адносін да рэчаіснасці, якія характэрны наогул для ўсёй мастацкай літаратуры.

У паэме «Новая зямля» багата сімволікі. І, разам з тым, яна напоўнена яскравай прадметнасцю. Гэтулькі ў ёй падрабязнасцей, дэталей, рэчаў, праяў!

А за ўсім гэтым, дакладней, з усяго гэтага вынікае, паўстае вобраз роднага, абжытага да апошняй рыскі, свету, у сувязі з якім ідэнтыфікуе сябе аўтар-апавядальнік. Менавіта гэты абагульнены вобраз «роднага кута», які складаецца з мноства фізічна адчувальных праяў, і можна назваць галоўным сімвалам паэмы.

У абодвух выпадках — задумваючы «Новую зямлю», а таксама «Сымона-музыку» — Колас адштурхоўваўся ад рэальнасці, ад чагосьці канкрэтнага, што сапраўды мела месца ў жыцці. Толькі кожным разам гэта было па-свойму, у розным мастацкім выкананні. «Новая зямля» ўзнікала з уласнага жыццёвага досведу аўтара, трансфармаванага памяццю і мастацкімі задачамі. А задума «Сымона-музыкі» першапачаткова грунтавалася на пачутай калісьці гісторыі пра пастушка, які сышоў з дому.

Напачатку «Новай зямлі» апавядальнік, наракаючы на жыццёвыя абставіны і згадваючы з замілаваннем родны кут, выказвае жаданне «дарогу жыцця па па-радку // Прайсці яшчэ раз, азірнуцца, // Сабраць з дарог камённі тыя, // Што губяць сілы маладыя...» Іначай кажучы, вярнуцца ў пару дзяцінства, у час незайманых, найбольш яскравых уражанняў і адчуванняў. На мове традыцыйнай сімволікі гэтае памкненне фармулявалася так: «К вясне б маёй хацеў вярнуцца». Услед за выказваннем гэтага жадання другая страфа паэмы прысвячаецца якраз развагам пра вясну, недасяжнасць і незваротнасць якой успрымаецца як наканаванне: «Не вернешся, як хваля тая, // Ка мне, вясна ты маладая!..»

Матыў адарванасці ад роднага асяроддзя (аўтабіяграфічны матыў зняволенага на той час аўтара), што так выразна, як запеў, прагучаў на пачатку «Новай зямлі», не так адкрыта і не так аўтабіяграфічна, але заяўляе аб сабе і на пачатку «Сымона-музыкі». Паэма пачынаецца са своеасаблівага ўступу, звязанага з сюжэтам толькі ўскосна. У ім фігуруюць два вобразы-алегорыі — жытнёвага коласа, адкінутага ветрам наўзбоч палетка, і лістка, які вось-вось адарвецца ад матухны-ліпы, бо страчвае з ёй радзімную повязь.

Мяркую, што ва ўступнай частцы паэмы насамрэч адбываецца дыялог аўтара і героя, якія паўстаюць у такіх алегарычных вобразах. Звернем увагу на тое, што першы з гэтых вобразаў супадае з псеўданімам паэта. Ён «адарваны ад загона», для яго вясна «у вечнай страце». За гэтым прачытваецца ўласны лёс аўтара. Пра вясну як пра жыццёвую страту гаворыцца, такім чынам, і ў «Сымоне-музыку».

Цяжкая доля выпала коласу (Коласу), але яшчэ цяжэйшы лёс у таго лістка, які «ў сваёй сям'і без ласкі, // Бы не родны, а прыблудны». Сымон-музыка, народны самародак, выбіваецца з роднага асяроддзя, бо ён «не такі», не падобны да іншых. І таму яму наканавана доўгае падарожжа па шляху спазнання свайго прызначэння як мастака.

У «Новай зямлі» аўтар з увагай ставіцца да ўсіх жыццёвых, побытавых клопатаў і спраў, якімі жывуць яго героі. Іх свет складаецца з мноства рэчаў, кожная з якіх займае сваё, пэўнае месца. Зямля — асноўны канцэпт паэмы. Чалавек, які працуе на зямлі і з гэтай працы мае свой хлеб надзённы, па-асабліваму цэніць кожную рэч, бо гэта звыклае асяроддзе яго існавання, канал яго сувязі са светам. Рэчыўнасць надае трываласць існаванню, з'яўляецца надзейным апірышчам.

Але ёсць і больш шырокі гарызонт, якога сягае зрок коласавага героя. Гэта прырода, у атачэнні якой праходзяць дні ягонага жыцця. Судакрананне з прыродным скіроўвае зрок тубыльца ад будзённага да адвечнага. У «Новай зямлі» ўсё — і побытавае, і адвечнае, таемнае, неспазнанае — знаходзіцца побач, спалучаецца ў адзіным акце экзістэнцыйнага ўсведамлення чалавека. Метафізічнае прабіваецца скрозь тоўшчу побытавага, нібы сонечны промень. Вось, да прыкладу, як прыадчыняецца заслона побытавых клопатаў, выяўляючы таемны свет быцця, напачатку 9-га раздзела. У лесніковай хаціне прачынаецца гаспадыня, каб зноўку аддацца звычайным паўсядзённым клопатам («Пайшла каровак падаіла // І бульбу свінням перамыла». І вось з-за лесу ўзыходзіць сонца. І разам з тым

быццам па-іншаму асвятляецца ўсё навакольнае, набываючы глыбінны быццёвы сэнс. Так вось, паміж згадкамі пра мыццё бульбы для свіней і ранішняй пабудкай малых пастушкоў, якім трэба гнаць кароў на пашу, узнікае ці не самы глыбока філасофскі ў паэме роздум над чалавечым жыццём у супастаўленні яго з вечнасцю:

Праменні, стрэлы залатыя,
Макушы лесу прабіваюць
І блескам-ззяннем высцілаюць
Нябёсаў багны патайныя.
Ў чародах светаў незлічоных,
Нерасчытаных, неадмкнёных,
Людскі наш лёс — былінка поля,
Пылок нязначны — наша доля,
А нашы радасці і слёзы,
*Надзеі светлыя, пагрозы*
І ўсё, чым жыцце нас вітае,
Яно адзначнасці не мае
У звязку гэтых светаў Божых,
Таемных, страшных і прыгожых…

Словы гэтыя, вядома, належаць аўтару-апавядальніку, кругагляд якога шырэйшы, чым у ягоных герояў. У полі зроку ён утрымлівае значна больш абсяг з'яў і мае большыя магчымасці для іх абагульнення. Тут знойдзем выразныя прыкметы аўтарскага светапогляду і аўтарскай паэтыкі, нават характэрныя для яго вобразы, як, да прыкладу, *багны нябёсаў*.

Аўтар-апавядальнік, займаючы пазіцыю гранічнай набліжанасці да сваіх герояў, перажывае разам з імі ўсе моманты іхняга жыцця. Ён, па-сутнасці, сам знаходзіцца сярод іх, і нават у дзвюх іпастасях: як дзейная асоба, хлопчык Кастусь, і як той, хто згадвае сцэны мінулага жыцця. У другім выпадку апавядальнік фармальна знаходзіцца па-за межамі выяўленага свету, але ментальна неадлучны ад яго, паколькі гэта менавіта *ягоны свет,* хоць цяпер і ўспрымаецца звонку як свет *мастацкі.* Аповед у «Новай зямлі» якраз адметны тым, што ў ім спалучаюцца ў адно адзінае погляды *знутры* і *звонку*. З гэтай падвоенасцю апавядальніцкай пазіцыі звязана шырыня кругагляду і светаадчування, выяўленая ў паэме. Практычны падыход да многіх рэчаў, які ўласцівы народнаму светагляду і ладу жыцця, не ўступае ў відавочную супярэчнасць, а, наадварот, паядноўваецца з іншым, праз які выяўляецца паэтычнае стаўленне да з'яў рэчаіснасці.

Возьмем для прыкладу сцэну панскага палявання, якая канчаецца тым, што пан Свіда забівае глушца. Звычайная, як быццам, справа на паляванні. Пан радуецца сваёй удачы, «Рублём Міхала ён трактуе, // Цыгаркай хвацкаю частуе». Але з якім драматычным напружаннем і ўзвышана-паэтычнай інтанацыяй перадаецца малюнак глушцовага такавання! Тут самавітае ў сваёй прадметнай паўнаважкасці народнае слова (глушэц «балбоча, крэхкае і свішча») дапаўняецца і ўзбуйняецца выказваннем у іншым, высокім стылі, што дае магчымасць убачыць відовішча ў незвычайным ракурсе. Пра таго ж глушца гаворыцца і такім вось чынам: «А мо хваленні жыццю правіць // І гэты бор спрадвечны славіць».

«Новая зямля» — твор шматпланавы, у якім паяднаны розныя бакі рэчаіснасці, розныя праявы жыцця чалавечага духу. Камічнае ўшчыльную мяжуе з трагічным. Вось і ў гэтым эпізодзе палявання на глушцоў знаходзім моманты гумарыстычнага зніжэння, калі Міхал падступна здзекуецца з пана Свіды, змушаючы таго паўтараць усе свае рухі. «Як скокну я — і пан хай скача; // Спынюся я — і пан спыніся!» Герой паэмы адчувае маральнае задавальненне ад таго, што хоць аднойчы мужыку давялося атрымаць перавагу над панам і той выконвае ягоныя каманды. Скокі, якія, быццам у нейкім дзівосным танцы, выконвае Міхал,

а ўслед за ім пан, выглядаюць пацешна: «Міхал даў знак. Скок-скок! спыніўся, // З ім радам Свіда апыніўся». А канчаецца ўсё гэта драматычна, пагібеллю глушца, жывой істоты. Смерць глушца апісваецца апавядальнікам яскрава і эмацыйна. Спадаючы долу, глушэц назаўжды разлучаецца са старой хвояй, з якою ён «даўно зрадніўся». «У момант звяў і страціў сілы // І не паспеў разняць ён крылы, // На мяккі дол, на мох зялёны // Упаў, насмерць акрываўлёны...»

## Паэтызацыя зямлі

Поруч з сімвалічным, Колас часта карыстаецца метафарычным вобразам, вобразам-параўнаннем. Ён наогул заўсёды звяртае пільную ўвагу на тропіку, асабліва на такія яе разнавіднасці, як параўнанне, супастаўленне, паралелізм. Колас — вялікі майстар вобразнасці, заснаванай на параўнанні розных, звычайна сэнсава аддаленых адна ад адной рэчаў і з'яў. У гэтым ён ідзе ўслед за Мікалаем Гогалем, для якога вельмі важным было стварэнне такім чынам эфекту кантраснасці і камізму. З дапамогай разгорнутага параўнання Колас выяўляе спецыфічнае стаўленне да прыроды, характэрнае для народнага светасузірання. У 4-м раздзеле «Новай зямлі», у якім гаворыцца пра гаспадарчыя клопаты лесніковай сям'і і пра намаганні, якія прыкладаюцца для таго, каб адрадзіць занядбаную зямлю, паяўляецца вобраз руні, што ўздымаецца з глебы, падобна дзіцяці з калыскі. «Так гэта збожжайка зялёна // Да сонца цягнецца лісткамі, // Бы к матцы дзіцятка рукамі». Так выражаецца пачуццё любасці да прыроднага атачэння і ўсяго, што ўспрымаецца як надзеленае жыццёвай сілай і блізкае сваёй быццёвай існасцю чалавеку. У іншым эпізодзе таго ж раздзела Міхал з замілаваннем аглядае збажыну і гладзіць жытні колас рукою, «нібы сынка свайго малога».

Колас атрымаў усеагульнае прызнанне як «пясняр прыроды». Героі «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі» жывуць у атачэнні прыроды і звязаныя з ёю вельмі шчыльнымі повязямі. Прырода для іх крыніца жыцця, але таксама і эстэтычных уражанняў. Выявы прыроды Коласам эстэтызаваны.

Героі «Новай зямлі» звязаны з прыродай найперш практычнымі дачыненнямі. Яна дае ім сродкі для жыцця, калі скупей, а калі і больш шчодра надзяляе сваімі дарамі. Але гэтыя адносіны не чыста ўтылітарныя. Яны прасякнуты пачуццямі суперажывання з боку чалавека да ўсяго, што яго акаляе, асабліва да з'яў жывой, арганічнай прыроды. Вось дзеці разам з дзядзькам Антосем ідуць у лес здабываць бярозавік. Знаходзяць патрэбнае дрэва. Увесь працэс апісваецца з такой выразнай дэталёвасцю, што чытач можа адчуць амаль фізічна сваю прысутнасць пры гэтым:

Знайшлі бярэзінку, спыніліс.
Залысіў дзядзька дрэва злёгку
(Сякерка востра, кара крохка),
Зрабіў заруб, латак прыправіў,
А пад латак гаршчок паставіў.

Тут пакуль што навідавоку практычны бок справы, хоць зробленая як бы між іншым заўвага пра тое, што «сякерка востра, кара крохка», кранаецца ў некаторай ступені пачуццяў суперажывання. І далей гэтыя пачуцці выяўляюцца ўжо адкрыта:

І соку кропелькі, як слёзы,
Як град, пасыпаліс з бярозы,
Аж шкода нейк было дзярвякі:
Здаваліс ранай тыя знакі,
Адкуль паліўся сок халодны
І пакідаў свой комель родны.

Бярозавік, што пакідае «свой комель родны» — гэты кранальны, хоць у дадзеным выпадку быццам і лакальны вобраз, можна разглядаць як адно з увасабленняў матыву выгнанніцтва і адрынутасці ў паэзіі Коласа. Гэты матыў выразна гучыць напачатку «Новай зямлі», калі аўтар-наратар распавядае пра сваё адчуванне адарванасці ад «роднага кута». Той жа, па сутнасці, матыў знаходзіць алегарычныя ўвасабленні ў паэме «Сымон-музыка» (адарваны ад дрэва лісток; колас, занесены з палетка на ўзмежак). Ды і сам пратаганіст паэмы паўстае як сімвалічны вобраз адарванага ад роднай глебы, ад свайго натуральнага асяроддзя мастака.

Прырода ўздзейнічае ў «Новай зямлі» на чалавека, уносячы ў душу радасць і заспакаенне, але і чалавек, у сваю чаргу, адплачвае ёй, аддаючы часціну сябе. Узнятая людской працай з запусцення, зямля набывае зусім іншы выгляд. «Ўсё зацвіло, загаманіла, // Бы жыватворчая тут сіла // Ад сну прыроду абудзіла».

Зямля, асабліва ўраджайная, якая можа стаць асноваю дабрабыту, міфалагізуецца ў свядомасці герояў паэмы, набывае ўсе адзнакі міфа пра бестурботнае жыццё ў дастатку. Гэта зямля, казачна шчодрая на дары, якімі яна надзяляе сваіх апекуноў і шчыроўцаў. Пра *такую* зямлю як жыццёвую мрою распавядае на пачатку паэмы Міхал, прыйшоўшы з чарговага ляснога абходу. Там і качаны капусты вырастаюць памерам з вядро, і конь «хаваецца з дугою» ў збажыне. Пад канец паэмы Міхал з братам робяць практычныя крокі па набліжэнні да сваёй мары, выпраўляючыся ў дарогу, каб убачыць на свае вочы тую запаветную зямлю. Апавядальнік з усмешкай заўважае, што «Яе Міхал — прыпомнім гэта — // Апісваў фарбамі паэта». Апавядальнік з добрай дозай іроніі і сумнення выказваецца наконт адпаведнасці мараў сапраўднасці. Міхал маляваў райскія шчадроты ў сваім уяўленні, яшчэ не пабачыўшы насамрэч прадмета свайго захаплення.

І вось падарожнікі дасягаюць мэты свайго падарожжа. І тут зямля зноў набывае рысы райскага кутка, але ўжо ў вуснах таго, хто збіраецца яе прадаваць. Хадыка называе яе нават залатой (пазней апавядальнік вазьме гэтае азначэнне ў двукоссі, намякаючы тым самым на звычайныя ў такіх выпадках перабольшанні прадаўца). Паказваючы зямельны надзел пакупнікам, Хадыка гаворыць: «Вось яна тут, уся валока, // Глядзіць на нас, як Божа вока». У ягоным аповедзе нават сена «ядкое, брацікі, на дзіва», настолькі, што «запраў, дык будзе есці поп». Як бачым, гіпербалізацыя з’яўляецца неадменнай прыкметай узвышэння зямлі-карміцелькі ў свядомасці герояў. І гэта нісколькі не супярэчыць практычнаму падыходу да зямлі, рацыянальнаму ўсведамленню карысці, якую можна займець ад стасункаў з ёю. Той жа Хадыка пералічае даброты, якія прынясе гаспадарам ягоная зямля:

Хто мае здольнасць, сілы, рукі
І гаспадарскія навукі,
Той азалоціцца, мужчынкі!
Прыдбае хлеба і скацінкі
І будзе жыць ён сабе панам
І складваць грошы чыстаганам.

У гарманічныя адносіны герояў «Новай зямлі» з зямлёю-карміцелькай могуць, аднак, пранікаць сацыяльныя дысанансы, як гэта адбываецца, калі Міхалава сям’я даведваецца, што ім выпадае зноў з’язджаць з наседжанага месца. Разам з пратэстам супраць панскай сваволі і нараканнем на свой лёс міжволі праяўляецца ў канцы 4-га раздзела і пачуццё адчужанасці ад *не сваёй* зямлі: «Рабі, працуй, кладзі ты сілы // У гэты дол чужы, пастылы // І горкім потам аблівайся...» Звернем увагу: калі героі вядуць сумоўе з зямлёю наўпрост, без пасярэдніцтва чужой ім сілы — яны адчуваюць душэўнае задавальненне, а «адбітак згоды» кладзецца на

ўсё прыроднае навакolle. А калі між імі і зямлёй, на якой яны працуюць, узнікаюць пабочныя, варожыя ім перашкоды, зямля стаецца не зямлёй, а **долам**. Зусім іншае сэнсавае гучанне набывае адзін з асноўных вобразаў-сімвалаў коласаўскай паэтыкі, калі патрапляе ў семантычнае поле сацыяльных дачыненняў.

Колас — прызнаны майстар паэтычнага пейзажу. Коласавы малюнкі прыроднага асяроддзя вызначаюцца, з аднаго боку, дакладнасцю выяўлення ўсяго, што патрапляе ў поле зроку аўтара, а з другога — глыбінёй мастацкага абагульнення, адкрыццём за рэальна ўспрыманымі прадметамі і з'явамі духоўна прадчутай перспектывы.

У 14-м раздзеле «Новай зямлі» распавядаецца пра тое, як адбываецца хатняе навучанне дзяцей з дапамогай нанятага хлапчука-«дарэктара». Гэта адзін з раздзелаў, у якіх найбольш выразна выяўляецца аўтарская ўсмешка, дзе аповед набывае гумарыстычнае гучанне. Адкрываецца ж раздзел аўтарскім словам (адступленнем) зусім іншай танальнасці. Тут гучыць акурат філасофская тэма памежнасці жыцця і смерці, красавання і згасання, навеяная восеньскімі краявідамі. Уводзіцца гэтая тэма якраз па кантрасце з асноўнай тэмай раздзела. *Водгулле* і *суладдзе* — два асноўныя акцэнты ў роздуме апавядальніка над плыннасцю жыцця і непазбежнасцю змен у прыродзе і ў свядомасці чалавека. Восень — тая пара для аўтара, «калі душа ўсяе прыроды // З тваёю злучыцца душою // Ў адным суладзі і настроі». Як пра чалавечую душу, гэтаксама гаворыцца і пра душу прыроды! Гэтая суладнасць прыроднага і чалавечага дыктуе ўзвышаны стыль, які выяўляецца найперш у лірычных аўтарскіх адступленнях.

## Коласаўскі наратыў

Параўнанне галоўных паэм Коласа — «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі» — звычайна праводзіцца ў плане супастаўлення прадметна-рэчыўнага і ўмоўна-сімвалічнага светаў, выяўленых у іх. Аднак мастацкая адметнасць гэтых твораў можа выяўляцца і праз іншыя спосабы суаднясення. Адзін з найбольш прадуктыўных, па нашым меркаванні, — наратыўны падыход.

Галоўныя Коласавы паэмы, як і ўсю ягоную эпіку, немагчыма сёння прачытаць у поўнай меры без выкарыстання *наратыўнай метадалогіі,* без высвятлення таго, *якім чынам* вядзецца аповед пра выяўленыя ў творы падзеі, абставіны і характары.

Сюжэты Коласавых паэм, на першы погляд, вельмі розныя. Значна адрозніваюцца хранатопы гэтых твораў. У «Новай зямлі» ён больш статычны, паколькі ўвасабляе аселішча леснікова сям'і, іх жыццёвае асяроддзе. У «Сымоне-музыку» — рухомы, зменлівы, адпаведна пераменам у лёсе галоўнага героя. Вызначальнай дамінантай сюжэта гэтай паэмы выступае матыў *вандроўніцтва.* Але пра такі ж матыў, няхай сабе не так выразна абазначаны, можна гаварыць і ў адносінах да «Новай зямлі». Сям'я лесніка Міхала вымушана перасяляецца з адной службовай сялібы-пасады на іншую, і разам з тым перад імі адкрываюцца новыя краявіды і жыццёвыя перспектывы.

Калі параўноўваць «Новую зямлю» і «Сымона-музыку» ў нараталагічным плане, то атрымоўваецца даволі парадаксальная рэч. «Новая зямля» больш набліжана да прадметнага свету, які прадстаўлены ў ёй аб'ектывізавана, з дэталізаванымі падрабязнасцямі. У «Сымоне-музыку» значна выразней праяўляецца суб'ектыўнасць адчуванняў. Разам з тым, аповед у «Новай зямлі» ў большай меры выяўляе пункт гледжання менавіта яго суб'екта, аўтара-наратара. Аўтарскія адступленні надаюць твору асаблівую медытатыўна-лірычную адметнасць. Час ад часу апавядальнік нагадвае чытачу пра сваю прысутнасць, пра тое, што ўсё ўбачана менавіта яго вачыма і захавана яго памяццю (напрыклад, «Я помню дзень той. Вечарэла…» Сюжэт «Новай зямлі» ўяўляе з сябе не што іншае, як успаміны

аўтара пра часы свайго маленства, а, значыць, ён непазбежна прасякнуты суб'ектыўнымі настроямі.

Уся паэма «Новая зямля» перамяжаецца аўтарскімі адступленнямі, у якіх выяўляюцца адносіны да апавяданага, непасрэдна выказваюцца развагі і адчуванні аўтара. Аднак асаблівым месцам у творы, дзе сканцэнтраваны аўтарскія назіранні, пачуцці і думкі, з'яўляецца раздзел «Летнім часам». Па сутнасці, увесь ён уяўляе не што іншае, як лірычнае аўтарскае адступленне, адметны гімн жыццю, прыродным сілам, людской працы. У нейкім сэнсе гэты раздзел можна лічыць своеасаблівым тэкстам у тэксце, паколькі ён валодае пэўнай кампазіцыйнай і сэнсавай самастойнасцю. Ён уключае ўсе важнейшыя моманты летніх клопатаў чалавека ў яго дачыненнях з зямлёй. Малюнкі касьбы, жніва, збору грыбоў, летняй навальніцы ўводзяць чытача ў свет, які вызначаецца быццёвай глыбінёй і самадастатковасцю. Аўтар, паглыбляючыся ў сваіх успамінах у гэты неверагодна прыцягальны свет, быццам забывае на нейкі час на сваіх герояў і іх справы.

Для «Новай зямлі» характэрна складаная сістэма структурнага спалучэння пунктаў гледжання аўтара-апавядальніка і персанажаў. У тэксце ёсць мясціны, дзе выразна размежаваны іх маўленчыя кампетэнцыі, а ёсць і такія, дзе размежаванне невідавочнае. Асабліва гэта датычыцца суаднесенасці адзнак, што адносяцца да сферы свядомасці суб'ектаў нарацыі.

Чый пункт гледжання выяўляецца ў апісанні вяртання Міхала з ранішняга абходу лесу (раздзел 2)? Ляснік Міхал непаспешліва скіроўваецца дадому, але паранейшаму прафесійна ўважны да сваіх службовых абавязкаў. «Часамі, стаўшы, азіраўся // І прыслухоўваўся да зыкаў // Ляснога шуму, яго крыкаў // Ды нюхаў дух той, поўны вару: // Такая суш — крый бог пажару!» І адразу пасля гэтага падаецца пейзажная замалёўка, якая прасякнута захапленнем прыгажосцю навакольнага і заканчваецца воклічам «Эх, слаўна ў лесе, слаўна, братцы!» Чыймі ж вачыма ўспрымаецца лясное харасцтво, хто глядзіць і пільна заўважае ўсе праявы ляснога жыцця? Для лесніка Міхала ўсё навакольнае, вядома, не навіна, а звыклае і штодзённае асяроддзе і месца працы. Несумненна, што ў апісанні і ўсхваленні прыродных з'яў выяўляецца пункт гледжання аўтара-апавядальніка. Але аўтарскі дыскурс тут блізка судакранаецца з тым, чым жыве герой твора, Міхал, з яго «раздум'ем адзінокім».

Апавядальнікам час ад часу падкрэсліваецца, што ён узнаўляе думкі героя, ход ягонага мыслення («Другія думкі на Міхася // Цяпер найшлі нейк неўзаметкі...» Аднак такі пераказ можа паступова пераходзіць ва ўнутраны маналог героя. Адбываецца гэты пераход спакваля, непрыкметна, паколькі апавядальнік і герой гавораць аб адным і тым жа. Салідарны з героем апавядальнік проста саступае напору нахлынулых на героя думак і ў ягоны аповед прарываюцца эмацыйныя інтанацыі голасу героя:

> Цярпі! чаму? дакуль цярпенне?
> Калі канец яму, рушэнне?
> Няўжо ўвесь век жыць з панскай ласкі
> І перад ім чуць абавязкі?
> І слугаваць яму, старацца
> І ў тры пагібелі згінацца?

Быццёвае, сацыяльнае і эстэтычнае ў сваёй спалучанасці прасякае мастацкі свет абедзвюх галоўных паэм Коласа. Адбываецца гэта дзякуючы таму, што голас аўтара-апавядальніка ў сюжэтнай плыні і вылучаецца з шматгалосся герояў, і гранічна зблiжаецца з ім, дасягаючы тым самым паўнаты мастацкага выражэння. Там, дзе героі самі не могуць да канца выказаць тое, што складае сутнасць іх парыванняў і лятункаў, слова бярэ аўтар-апавядальнік. А прамаўляе ён у такім выпадку не толькі ад сябе, але за сваіх герояў.

## Прытчавасць, алегарызм

Паэма «Сымон-музыка» «падаваць голас аб сабе» пачала, паводле ўспамінаў Коласа, «бадай што раней за "Новую зямлю"». Першыя накіды паэт пачаў рабіць, знаходзячыся ў мінскай турме. Якраз умовы, у якіх ён апынуўся ў зняволенні, паўплывалі на фарміраванне задумы паэмы.

Пра думкі самога аўтара наконт паэмы «Сымон-музыка» можна даведацца з кнігі М. Лужаніна «Колас расказвае пра сябе». Якуб Колас, як згадвае Лужанін, дзівіўся, чаму даследчыкі не прыкмячаюць аўтабіяграфізму гэтага твора. Калі «Новая зямля» ва ўспрыманні крытыкаў вызначалася сваім аўтабіяграфізмам, бо гэта ляжала на паверхні, «вачамназаляла», то «пра "Сымона-музыку" ніхто ў такім кірунку не абазваўся».

Калі першая з паэм была прасякнута зямным, тым, што мела дачыненне да паўсядзённага побыту, які перарастаў у быццё, што засведчвала сама яе назва, то другая была скіравана ў бок мастацтва і фантазійнага ўяўлення, распавядала, па словах Ганны, «аб жыцці тым, што за намі». У «Сымоне-музыку» погляд аўтара і ягонага героя, не сказаць каб адрываецца ад зямлі, але ў той жа час сягае нябесных вышынь. Гукі быцця, якімі напоўнена душа Сымона, маюць зямное паходжанне, зыходзяць ад таго, што акружае юнага музыканта. Але водгалас яны знаходзяць у надземных прасторах, там, дзе лунае «дух сусвету». Першая спатканне Сымона з Ганнай. Размова заходзіць пра начныя галасы, да якіх чуйна прыслухоўваецца Сымон. Ён пытаецца ў Ганны, няўжо ёй не чутно, «Як у лесе дрэва з дрэвам // Ціха, важна загудзе, // І як жыта шумам-спевам // Мову-песню павядзе?» На што тая адказвае, што яе палохаюць гэтыя гукі. «Можа гэта толькі здань, // Або нечысная тхлань?» Ганна падазрае, што ў гэтым гучанні, якое Сымон успрымае такім адухоўленым, можа таіцца інфернальнае. Сымон супакойвае яе.

> Ты не бойся: не пасмее
> Злыдзень нават падступіцца,
> Бо дабром і згодай вее,
> Ён той згоднасці баіцца.
> Спіць усё, а дух сусвету
> З духам лучыцца зямлі
> І адводзіць ліхасць гэту,
> Каб шчаслівы ўсе былі.

У гэтых словах самародка-музыкі думка-развага пра сусветную гармонію дасягае сапраўды гётаўскага размаху.

Кампазіцыя «Сымона-музыкі», у адрозненне ад «Новай зямлі», складаная, шматпластовая, яна ўключае ў сябе элементы драматычнага твора, у большай ступені насычана дыялогамі. Багата ў паэме аповедаў, што з'яўляюцца, па сутнасці, *творамі ў творы*, цэласнымі і завершанымі тэкстамі. Вось і ў канцы размовы з Ганнай пра таямніцы свету Сымон расказвае ёй «казку-гора» пра дуб і зробленую з яго дудку. Гэты твор у творы мог бы быць з поўным уключаным у славуты коласаўскі цыкл «Казкі жыцця». Па жанравых прыкметах, як прытча пра быццёвую ўспрымальнасць мастацтва, гэты аповед цалкам адпавядае алегарычнай мове твораў з цыкла «Казкі жыцця». Суадносіцца ён і з фальклорнай традыцыяй выяўлення цудадзейнай сілы мастацтва.

У казцы-прытчы, расказанай Сымонам, праглядаюцца алюзіі і на сапраўднае становішча, у якім ён на той час знаходзіўся. Гэта тая мясціна, дзе гаворыцца пра тое, як «падарожны» выпраўляецца ў свет «з тою дудкай жабраваць».

Прытчы, алегорыі, характэрныя для паэмы «Сымон-музыка», збліжаюць яе з «Казкамі жыцця». Ды і сама яна ў першым выданні 1918 года мела жанравае азначэнне *казка жыцця*.

## Родны кут — родны край — далёкі край

У абедзвюх паэмах выразна выяўляе сябе голас аўтара, які ў пэўныя моманты пачынае выступаць у аўтаномным гучанні. Адным з вядучых матываў у аўтарскіх адступленнях з'яўляецца патрыятычны. У «Сымоне-музыку» назіраем пашырэнне абсягаў патрыятычнай тэматыкі: «родны кут» як вобразнае ўвасабленне «малой радзімы», роднага аселішча, замяняецца тут «родным краем», а гэта ўжо паняцце, суадноснае з усёй Радзімай, з тэрытарыяльнымі межамі пражывання этнасу. Зрэшты, у першых радках аўтарскага адступлення (або аўтарскага *ўступу*), якім пачынаецца трэцяя частка паэмы «Сымон-музыка», гэтыя канцэпты — *край* і *кут* — змяшчаюцца яшчэ побач: «О, край родны, край прыгожы! // Мілы кут маіх дзядоў!»

У першым раздзеле «Новай зямлі» аўтар-апавядальнік выяўляе свае настальгічныя настроі ва ўспамінах пра пакінуты родны кут. У вышэйзгаданым аўтарскім адступленні з «Сымона-музыкі» думкі аўтара адносна роднага краю становяцца больш шматмернымі. Яны кранаюцца не толькі прыроды і побыту, але і сацыяльна-гістарычнай праблематыкі. Лёс роднага краю разглядаецца ў гістарычнай праекцыі. Не толькі прыгожыя краявіды паўстаюць перад унутраным зрокам аўтара-апавядальніка, але і «Адвечныя курганы, // Сведкі прошласці глухой». Ягоная родная зямля — месца, дзе «Схадзіліся плямёны // Спрэчкі сілаю канчаць». Гістарызм аўтарскага мыслення ў гэтых глыбокіх роздумах блізкі купалаўскаму, што сведчыць пра агульную скіраванасць абодвух класікаў беларускай літаратуры да пошуку нацыянальнай ідэнтычнасці ў часавым вымярэнні, падсумавання вынікаў пройдзенага народам шляху і выяўлення спадзяванняў на будучыню. У курганах захаваны сведчанні даўніх дзеяў, але і сам апавядальнік можа распавесці шмат аб чым з мінулага і з таго, што ўяўляецца яму актуальным на цяперашні час. Выказваецца ён і пра тое, што сёння родны край «разарваны» (маюцца на ўвазе наступствы рыжскай дамовы), згадвае і пра рэлігійную раз'яднанасць, якая прыносіла шмат бед народу. І паколькі галоўная тэма паэмы — роля мастацтва ў станаўленні нацыянальнага самаўсведамлення, словы пра трагічны лёс мастакоў з народа гучаць найбольш пафасна і пранікнёна.

> Колькі талентаў звялося,
> Колькі іх і дзе ляжыць
> Невядомых, непрызнаных,
> Не аплаканых нікім,
> Толькі ў полі адспяваных
> Ветру посвістам пустым!

Адразу пасля аўтарскага адступлення, якім пачынаецца трэцяя частка паэмы, высвятляецца, што Сымон пакідае дзеда-жабрака і нават не развітаўшыся з Ганнай, светлае пачуццё да якой зарадзілася ў ім, выпраўляецца далей у неспазнаны свет. Аўтар дае магчымасць герою самому выказаць свае адчуванні і памкненні. «Я пайду, адзін пайду я. // Вольны вецер хай гадуе // Мае думкі, мае мары...»

У паэме выразна праяўляецца драматычнае напружанне паміж такімі прасторавымі канцэптамі як *родны кут* і *далёкі край*, паміж абжытым аселішчам і прыцягальнасцю нязведанага. Дзед Даніла, якому грае Сымон, згадвае з часоў свае маладосці акурат «родны кут, далёкі край».

Сымона вабяць нязведаныя прасторы, дзе ён разлічвае знайсці жыццё, не падобнае да таго, якое бачыць навакол сябе. У ягоным маналогу жаданне адчуць сябе вольным паядноўваецца з памкненнем да адкрыцця *новага.* Менавіта прасторы чаруюць яго «*новым* краем», «клічуць к нейкім *новым* зорам», менавіта там ён спадзяецца пабачыць «свет *новы*», пачуць «*другія*» словы. І дарога, якая

разгортваецца перад Сымонам, — гэта «*новая* дарога» (курсіў мой. — *Я. Г.*). Такім чынам, для абедзвюх паэм Коласа канцэпт *новага* мае вялікае значэнне. Праз яго выяўляецца настроенасць герояў на змены ў сваім жыцці. Іншая справа, ці дасягаюць яны канчатковай мэты. На шляху вандроўнага музыкі Сымона шмат перашкод.

Сымонава жаданне волі і прастору выпрабоўваецца спакусай мець «прыпынак-кут», які прапаноўвае яму карчмар Шлёма. Звернем увагу: гэта не той кут, які ўспрымаецца *родным*, тоесным экзістэнцыйнаму самапачуванню чалавека як асобы, а толькі часовы *прыпынак* на жыццёвым шляху. Гэты прыпынак-кут апынуўся непрыветным для Сымона. Хітры і прагавіты карчмар не толькі скарыстоўвае ягоны музычны дар, але і робіць з яго служку, што выконвае задарма ўсякую хатнюю работу.

Сцэны ў карчме малююцца аўтарам яскрава і самавіта, з рэалістычнай выразнасцю і грунтоўнасцю. «З рук у рукі ходзяць чаркі, // А ў галовах бродзіць шум. // Пах гарэлкі, дым махоркі // Звіс пад столлю, як туман». У карчме можна пачуць аповеды пра ўсялякую бывальшчыну («Сёмка тут пачне казанне, // Як Мацюта лез на плот, // Як Чылін спяваў літанне, // Як жаніўся Лысы Дод…»), адбываюцца розныя трагікамічныя здарэнні («Тут бывала ў карк Піліпа // Жонка гнала з карчмы вон, // І аб сына стары Клыпа // Чапялу ламаў ці млён»). А калі наведнікі карчмы пускаюцца ў скокі, то наўсцяж трасуцца «сцены, дошкі пад нагой», падлога ад гэтых віхурных танцаў «гнецца, крэхча і рыпіць».

Пэўная сугучнасць «Сымона-музыкі» з «Новай зямлёй» выяўляецца якраз у пільнай зацікаўленасці аўтара-апавядальніка падрабязнасцямі побыту, яскравасці і маляўнічасці сцэн з жыцця, прадстаўленых у гэтых творах. Не толькі самотная засяроджанасць вандроўнага музыканта і яго ўнутраны свет вызначаюць адметнасць мастацкага свету паэмы, але і такія выдатныя вобразныя ўвасабленні як, да прыкладу, выява гульнёвага запалу ўдзельнікаў ігрышча ў вясковай карчме:

Дзецюкі, пабраўшы пары,
Тут лядалі, як віхры,
Як у полі на папары
У гіз бегаюць валы.
Верцяць дзевак, бы круцёлак,
На паветры іх нясуць,
Сцены, прыпек і пяколак
Іх хвальбонамі мятуць…

Пэўныя эпізоды ў «Новай зямлі», разгортваючыся як аповеды пра нейкія здарэнні, што адбываюцца з героямі, сваёй паэтыкай блізкія да вершаваных апавяданняў Коласа. Ёсць такія эпізоды і ў «Сымоне-музыку». Напрыклад, вызваленне Сымонам «паланёнай» Шлёмам скрыпкі і ўцёкі з ягонай карчмы. Аповед тут набывае рысы прыгодніцкага характару.

## Загадкі, таямніцы жыцця

Прырода паўстае ў творах Коласа як змясцілішча не толькі красы і жыццёвай моцы, але і неспазнаных таямніц сусвету. *Таемнае* займае ў абедзвюх паэмах значнае месца. Але ў кожнай з іх яно паўстае па-свойму.

Пастаянна звяртае ўвагу на розныя дзівосныя праявы, на таямнічасць свету Сымон-музыка. І яшчэ адзін чалавек у паэме задумваецца над таемным і незвычайным. Гэта дзед Даніла, які бярэ пад сваю апеку Сымона, калі той трапляе ў княжацкі замак. Ён не толькі заўважае праявы незвычайнага, але спрабуе даць ім сваё тлумачэнне, што адзначаецца апавядальнікам:

А Даніла быў ахвочы
Волю словам даць сваім
І даць нават тлумачэнне
З свайго погляду-знацця
Неразгаданым спляценням,
З'явам цёмнага жыцця.

У рамантычным абрамленні паўстае з дзедавых расповедаў замак, які, на ягоную думку, каб здолеў гаварыць чалавечаю мовай, мог бы адкрыць шмат «цёмных-цёмных плямак». Малююцца дзедам і шэсце «чорных манахаў» і званы, якія гучаць самахоць, і жывая галава, якую нясе жалобная працэсія і ў якой «Пазіраюць злосна вочы, // Зубы ляскаюць сярдзіта...» Многія з гэтых страхоццяў і самім Данілам успрымаюцца даволі скептычна, як плён людской фантазіі («Можа людзі выдумляюць, // То і я табе салжу»).

Пра загадкавыя з'явы прыроды, якія паўстаюць у дзіцячым уяўленні, гаворыцца ў «Новай зямлі». Але найбольш б'юцца над загадкамі быцця ўсё-такі ў «Сымоне-музыку», і, вядома, у першую чаргу галоўны герой. Аўтарам асабліва падкрэсліваецца ягонае імкненне да спазнання тых дзіўных з'яў навакольнага свету, з якімі ён сутыкаецца, якія назірае з ранняга маленства. На пытанні Сымонкі пра светаўладкаванне, з якімі ён звяртаецца не да сямейнікаў (якія занятыя прагматычнымі гаспадарчымі справамі і яго не разумеюць), а да дзядоў, з якімі зводзіць яго лёс. Тыя па-рознаму адказваюць на запытанні цікаўнага падлетка. Вось дзед Курыла, які «трымаў руку» свайго падпаска, «слаўны дзед, дзядок — душа». Дзед, які спрыяе Сымонку, бо зразумеў, што той «не просты ўдаўся», які і сам грае на скрыпцы, што пераходзіць пасля ў спадчыну хлопцу, адказвае ўсё ж з пазіцый практычнага розуму, успрымаючы ўсе з'явы свету як наканаванае. «Так утворан гэты свет» — вось асноўны сэнс адказу дзеда Курылы на таямніцы быцця. Задавацца якімісь сур'ёзнымі пытаннямі на гэты конт — марная справа! «І без нашага пытання // Колас вырасце ў раллі».

Дзед-жабрак, што ўзяў з сабой Сымонку, наогул адмахваецца ад якіх бы там ні было пытанняў. Адказ у яго просты: «Ты, Сымон, яшчэ дурніца...»

Найбольш здатным суразмоўцам стаецца трэці з дзядоў, паляўнічы Даніла, які за выратаванне князя пакінуты жыць пры замку, хоць больш за ўсё яго вабяць лясныя прасторы. На пытанні Сымона ён адказвае так:

— Эге ж, хлопчыку, на свеце
Многа розных ёсць загадак,
Ды для іх ёсць свой парадак,
Іх ключы — у іх прымеце.

У спосабах разгадкі таямніц быцця, якімі прапаноўвае карыстацца Сымону дзед, прысутнічаюць, як гэта ні падасца дзіўным, прыкметы *семіятычнага аналізу*, расчытвання глыбіннага сэнсу падзей па нейкіх пакінутых слядах і знаках. Дзед Даніла ў гэтай справе выяўляе свой досвед паляўнічага, ляснога следапыта. Усё пакідае за сабой след. Па асобнай прыкмеце можна здагадацца пра значэнне і магчымыя наступствы пэўнай з'явы. Прыкмет гэтых, па якіх можна меркаваць пра падспудныя прычыны і таемныя сэнсы з'яў рэчаіснасці, багата.

Аб іх вецер нам гаворыць,
І шумяць аб іх лясы,
І глядзяць яны з расы,
Аб іх кажуць неба зоры,
Воды ў рэчках і азёрах,
Ліст на дзераве і цвет, —
Многа, хлопча, тых прымет.

Стары паляўнічы мяркуе, «што ў жыцці мы, як у лесе, — // Пад уладай нейкіх слоў». Так, праз развагі гэтага персанажа аўтарам выказваецца ідэя, актуальная і для сучаснай лінгвістыкі, — пра ўплыў на свядомасць чалавека закладзенага ў мове кода.

Абмяркоўваючы з Сымонам загадкавы грукат у лесе, быццам валяць долу дрэвы, дзед Даніла разглядае гэтую праяву як прадвесце нейкіх будучых важных падзей, змен у існуючым парадку. Каб разгадаць падобныя таямныя знакі, трэба валодаць здольнасцю іх расшыфраваць.

Гэта ёсць прыкмета, знак,
Толькі трэба адгадаць іх.
Вось затым жа чалавеку
*І той розум, хлопча, дан,*
Каб ён мог зганяць туман,
Што гняце яго спрадвеку,
І каб змог ён, позна-рана,
Зняць няведання пячаць,
А той напіс неўчытаны
Растлумачыць, адгадаць.

Рамантычнай таемнасцю авеяны вобраз княжага замка. Згушчаная атмасфера непрыступнасці, чужасці і нават варожасці адбіваецца на першых ураженнях маладога музыкі, які апынуўся ў ягоных сценах. Гэты замак ён успрымае, як «страшны дом», напоўнены прывідамі. І зноў жа стары Сымонаў сябра, апавядаючы яму пра замак, гаворыць пра таемнае, нявыказанае, што тоіцца ў гэтых змрочных сценах. «Э, мой хлопчыку, каб замак // Мог, як людзі, гаварыць! // Колькі цёмных-цёмных плямак // Мог бы людзям ён адкрыць!..» Сцены княжага замка маўчаць, хоць час ад часу чуюцца ў іх розныя шолахі і шумы. Але ўсё ж і сваёй маўклівасцю, і ўсёй сваёй прысутнасцю яны *гавораць* даволі для ўразумення іхняй датычнасці да гісторыі.

* * *

Абедзве паэмы Коласа прыцягальныя для нас сёння не толькі тым, што паўстае перад чытацкім зрокам увідавочнена, але і тым, што хаваецца за даляглядамі бачання, што вабіць сваёй загадкавасцю і неспазнанасцю, сведчачы пра неабсяжнасць быцця.